ЗАЦВЕРДЖАНА
Рашэнне
Валожынскага раённага выканаўчага камітэта
01.11.2022 № 1640

# СТАТУТ
дзяржаўнай установы адукацыі
“Яршэвіцкая сярэдняя школа”
(Яршэвіцкая сярэдняя школа)
(Новая рэдакцыя)

# УСТАВ
государственного учреждения образования
«Яршевичская средняя школа»
(Яршевичская средняя школа)
(Новая редакция)

в. Яршэвічы
2022

## ГЛАВА 1
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Сапраўдны Статут дзяржаўнай установы адукацыі “Яршэвіцкая сярэдняя школа” (далей – Статут) з’яўляецца новай рэдакцыяй Статута «Яршэвіцкі навучальна-педагагічны комплекс дзіцячы сад – сярэдняя школа», зацверджанага рашэннем Валожынскага раённага выканаўчага камітэта ад 08.01.2019 № 16 і зарэгістраванага Валожынскім раённым выканаўчым камітэтам ад 14.01.2019, рэгістрацыйны № 690338834, у сувязі з прывядзеннем яго ў адпаведнасць з дзеючым заканадаўствам.

Статут рэгулюе парадак дзейнасці дзяржаўнай установы адукацыі “Яршэвіцкая сярэдняя школа” (далей – Установа).

2. Звесткі аб стварэнні, рэарганізацыі ўстановы адукацыі:

2.1. Яршэвіцкая сярэдняя школа перайменавана ў дзяржаўную ўстанову адукацыі «Яршэвіцкі навучальна-педагагічны комплекс дзіцячы сад – сярэдняя агульнаадукацыйная школа» рашэннем Валожынскага раённага выканаўчага камітэта ад 04.05.2005 № 343.

2.2. Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Яршэвіцкі навучальна-педагагічны комплекс дзіцячы сад – сярэдняя агульнаадукацыйная школа» перайменавана ў дзяржаўную ўстанову адукацыі «Яршэвіцкі навучальна-педагагічны комплекс дзіцячы сад – сярэдняя школа» рашэннем Валожынскага раённага выканаўчага камітэта ад 26.08.2011 № 1090.

3. Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Яршэвіцкая сярэдняя школа” (далей – Установа) адносіцца да тыпу ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі, па віду з’яўляецца сярэдняй школай.

4. Установа ажыццяўляе сваю дзейнасць у адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, Палажэннем аб установе агульнай сярэдняй адукацыі, Палажэннем аб установе дашкольнай адукацыі, Палажэннем аб парадку правядзення дзяржаўнай акрэдытацыі ўстаноў адукацыі, нарматыўнымі прававымі актамі органаў мясцовага кіравання і самакіравання і іншымі актамі заканадаўства, гэтым Статутам.

5. Поўная назва Установы:

на рускай мове – государственное учреждение образования «Яршевичская средняя школа»;

на беларускай мове – дзяржаўная ўстанова адукацыі “Яршэвіцкая сярэдняя школа”.

Скарочаная назва Установы:

на рускай мове – Яршевичская средняя школа;

на беларускай мове – Яршэвіцкая сярэдняя школа.

6. Месца знаходжання Установы: вул. Школьная, 35, 222367, в. Яршэвічы, Валожынскі раён, Мінская вобласць.

7. Заснавальнікам установы з’яўляецца Валожынскі раённы выканаўчы камітэт (далей – Заснавальнік), які прымае рашэнне аб стварэнні (рэарганізацыі, ліквідацыі) Установы і зацвярджае Статут.

8. Органам дзяржаўнага кіравання, упаўнаважаным кіраваць маёмасцю Установы, з’яўляецца ўпраўленне па адукацыі, спорце і турызме Валожынскага раённага выканаўчага камітэта (далей – Упаўнаважаны орган).

9. Маёмасць Установы знаходзіцца ў камунальнай уласнасці Валожынскага раёна і ў аператыўным кіраванні Упаўнаважанага органа.

10. Установа абслугоўваецца дзяржаўнай установай “Валожынскі раённы цэнтр па забеспячэнню дзейнасці бюджэтных арганізацый”.

11. Установа створана ў форме ўстановы на аснове дзяржаўнай уласнасці, з’яўляецца некамерцыйнай арганізацыяй, якая фінансуецца з рэспубліканскага, абласнога і раённага бюджэту, ствараецца, рэарганізуецца, ліквідуецца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, дзейнічае на падставе Статута, які зацвярджаецца Заснавальнікам у парадку, устаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

12. Установа з’яўляецца юрыдычнай асобай, з дня дзяржаўнай рэгістрацыі, у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь мае пячатку з выявай Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь, штамп са сваёй назвай, фірменныя бланкі, можа мець разліковы і іншыя рахункі ў банках Рэспублікі Беларусь.

13. Установа ажыццяўляе віды эканамічнай дзейнасці ў адпаведнасці з агульнадзяржаўным класіфікатарам Рэспублікі Беларусь АКРБ 005 – 2011 “Віды эканамічнай дзейнасці”.

14. Спецыяльны дазвол (ліцэнзія) на адукацыйную дзейнасць, дзяржаўная акрэдытацыя на адпаведнасць заяўленаму віду, пацвярджэнне дзяржаўнай акрэдытацыі на адпаведнасць заяўленаму віду Яршэвіцкая сярэдняя школа ажыццяўляюцца ў парадку, устаноўленым Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі і іншымі актамі заканадаўства.

15. Ва Установе не дапускаецца стварэнне і дзейнасць палітычных партый, іншых грамадскіх аб’яднанняў, якія маюць палітычныя мэты, а таксама стварэнне і ананімная або іншая дзейнасць рэлігійных арганізацый, якая супярэчыць заканадаўству.

16. Установа нясе ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку адказнасць за невыкананне функцый, аднесеных да яе кампетэнцыі.

17. Акрэдытацыя і пацвярджэнне акрэдытацыі Установы ажыццяўляецца ў парадку, устаноўленым дзеючымі актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

18. Дзяржаўны кантроль за забеспячэннем якасці адукацыі ажыццяўляецца ўпаўнаважанымі дзяржаўнымі органамі ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

19. Дзейнасць Установы спыняецца ў сувязі з яго рэарганізацыяй або ліквідацыяй у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 2
## ПРАДМЕТ, МЭТЫ І ЗАДАЧЫ ДЗЕЙНАСЦІ ЎСТАНОВЫ

20. Прадметам дзейнасці Установы з'яўляецца адукацыйная дзейнасць, якая ўключае навучанне і выхаванне ў ходзе рэалізацыі адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі, адукацыйнай праграмы пачатковай адукацыі, адукацыйнай праграмы базавай адукацыі, адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі, адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі, адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю, адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, адукацыйнай праграмы прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых), праграмы выхавання дзяцей і навучэнскай моладзі, праграмы выхавання дзяцей, якія маюць патрэбу ў аздараўленні, праграмы выхавання і абароны правоў і законных інтарэсаў дзяцей, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы; можа забяспечвацца вывучэнне асобных вучэбных прадметаў, модуляў на павышаным узроўні пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы базавай адукацыі, асобных вучэбных прадметаў, модуляў на павышаным узроўні ў рамках арганізацыі профільнага навучання пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі. -

21. Асноўнай мэтай дзейнасці Установы з'яўляюцца: забеспячэнне права навучэнцаў на атрыманне агульнай сярэдняй адукацыі з улікам іх індывідуальных патрэб, схільнасцей і запытаў, стварэнне спецыяльных умоў для развіцця іх творчага, інтэлектуальнага патэнцыялу, свядомага прафесійнага самавызначэння далейшай адукацыі і працоўнай дзейнасці.

22. Асноўнымі задачамі дзейнасці Установы з'яўляюцца: забеспячэнне якасці адукацыі;

развіццё інфармацыйнай прасторы ўстановы адукацыі для навучэнцаў, педагогаў, соцыума;

стварэнне бяспечных умоў, здароўезберагальнага асяроддзя для выхавання фізічна здаровай, духоўна багатай, высокамаральнай і адукаванай асобы;

стварэнне спецыяльных умоў для атрымання адукацыі асобамі з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця і аказанне гэтым асобам карэкцыйна-педагагічнай дапамогі;

выяўленне і падтрымка дзяцей, якія дасягнулі высокіх паказчыкаў у вучэбнай і грамадскай дзейнасці;

выяўленне і падтрымка дзяцей, якія маюць патрэбу ў аздараўленні;

стварэнне неабходных умоў для арганізацыі харчавання і медыцынскай дапамогі навучэнцаў;

павышэнне прафесійнай кампетэнтнасці педагогаў па пытаннях сучаснага зместу адукацыі;

стварэнне ўмоў для фарміравання грамадзянска-патрыятычнай, ідэалагічнай свядомасці вучняў, для ўсебаковай і разнапланавай пазакласнай і забаўляльнай дзейнасці;

узаемадзеянне з установамі адукацыі, спорту, аховы здароўя, іншымі дзяржаўнымі арганізацыямі і грамадскімі аб’яднаннямі; удасканаленне матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння адукацыйнага працэсу.

## ГЛАВА 3
## ПАРАДАК АРГАНІЗАЦЫІ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ

23. Адукацыйны працэс арганізуецца на аснове:

прынцыпаў дзяржаўнай палітыкі ў сферы адукацыі;

адукацыйных стандартаў;

дасягненняў у галіне навукі і тэхнікі, што рэалізуюцца ў галінах эканомікі і сацыяльнай сферы інавацыйных праектаў;

педагагічна абгрунтаванага выбару формаў, метадаў і сродкаў навучання і выхавання;

культурных традыцый і каштоўнасцяў беларускага народа, дасягненняў сусветнай культуры;

сучасных адукацыйных і інфармацыйных тэхналогій.

24. Адукацыйны працэс арганізуецца ў адпаведнасці з асноўнымі патрабаваннямі, а менавіта:

забеспячэнне якасці адукацыі;

кампетэнтнасны падыход;

ахова здароўя навучэнцаў;

захаванне ўстаноўленай працягласці вучэбнага года і канікул, тэрмінаў і форм атэстацыі навучэнцаў;

захаванне санітарна-эпідэміялагічных патрабаванняў;

стварэнне бяспечных умоў пры арганізацыі адукацыйнага працэсу;

стварэнне ўмоў для развіцця творчых здольнасцяў навучэнцаў, далучэнне іх да розных відаў сацыяльна значнай дзейнасці;

забеспячэнне сацыяльна-педагагічнай падтрымкі навучэнцаў і аказанне ім псіхалагічнай дапамогі;

педагагічная падтрымка дзіцячых і маладзёжных грамадскіх аб'яднанняў;

стварэнне спецыяльных умоў для атрымання адукацыі асобамі з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця.

25. Адукацыйны працэс павінен забяспечыць ахову здароўя вучняў, падтрыманне іх працаздольнасці на працягу вучэбнага дня, вучэбнага тыдня, навучальнага года, неабходную рухальную актыўнасць, развіццё індывідуальных здольнасцей па інтарэсах.

26. Для арганізацыі адукацыйнага працэсу Установа распрацоўвае вучэбныя планы на бягучы навучальны год на падставе тыпавых вучэбных планаў; выкарыстоўвае вучэбныя праграмы, зацверджаныя Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Вучэбныя планы зацвярджаюцца дырэктарам па ўзгадненні з Заснавальнікам.

27. Структура Установы складаецца з трох ступеняў:

I ступень – пачатковая адукацыя (I – IV класы);

II ступень – базавая адукацыя (V– IX класы);

III ступень – сярэдняя адукацыя (X – XI класы);

27.1. на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі рэалізуецца адукацыйная праграма пачатковай адукацыі.

Ведамасцю гадавых адзнак з класнага журнала за апошні год навучання і выхавання на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі пацвярджаецца атрыманне асобай пачатковай адукацыі, якая дае права на працягу адукацыі на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі пры пераводзе ў V клас.

27.2. на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі рэалізуецца адукацыйная праграма базавай адукацыі.

Агульная базавая адукацыя дае права на працяг адукацыі на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі, а таксама на ўзроўнях прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай адукацыі;

27.3. на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі рэалізуецца адукацыйная праграма сярэдняй адукацыі.

Агульная сярэдняя адукацыя дае права на працяг адукацыі на ўзроўнях прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай адукацыі.

Парадак уліку дзяцей, якія падлягаюць навучанню на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі, вызначаецца Урадам Рэспублікі Беларусь.

27.4. Тэрмін атрымання адукацыі:

тэрмін атрымання дашкольнай адукацыі вызначаецца законнымі прадстаўнікамі выхаванцаў. Пры гэтым тэрмін засваення зместу адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі складае да пяці гадоў дзесяці месяцаў і можа быць павялічаны на адзін год па медыцынскіх паказаннях або па меркаванні законных прадстаўнікоў выхаванцаў;

пачатковай адукацыі складае чатыры гады;

агульнай базавай адукацыі складае дзевяць гадоў;

агульнай сярэдняй адукацыі складае адзінаццаць гадоў.

27.5. Тэрміны навучання на ступенях агульнай сярэдняй адукацыі складаюць:

на I ступені – чатыры гады;

на II ступені – пяць гадоў;

на III ступені – два гады.

28. Штодзённая колькасць вучэбных заняткаў ва Установе і іх паслядоўнасць вызначаюцца раскладам вучэбных заняткаў, які складаецца з улікам санітарна-эпідэміялагічных патрабаванняў. Расклад вучэбных заняткаў зацвярджаецца дырэктарам.

29. Працягласць перапынкаў паміж вучэбнымі заняткамі вызначаецца зыходзячы з канкрэтных умоў працы ўстановы, неабходнасці забеспячэння арганізацыі харчавання вучняў і іх адпачынку ў адпаведнасці з патрабаваннямі санітарна-эпідэміялагічных патрабаванняў.

30. Прыём асобы для атрымання дашкольнай адукацыі ажыццяўляецца на падставе заявы законнага прадстаўніка выхаванца, медыцынскай даведкі аб стане здароўя, накіравання ў дзяржаўную ўстанову адукацыі для засваення зместу адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі, выдадзенага Упаўнаважаным органам.

31. Прыём (залічэнне) асоб для засваення зместу адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі ажыццяўляецца ў адпаведнасці з Кодэксам, Палажэннем аб установе агульнай сярэдняй адукацыі.

32. У I клас прымаюцца асобы, якім на пачатак адпаведнага навучальнага года спаўняецца шэсць гадоў. Па жаданні аднаго з законных прадстаўнікоў дзіцяці дапускаецца прыём у I клас асоб больш позняга ўзросту.

Па заяве аднаго з законных прадстаўнікоў непаўналетняй асобы пры наяўнасці рашэння педагагічнага савета дапускаецца прыём (залічэнне) у 1 клас асобы, якой шэсць гадоў спаўняецца ў бягучым годзе.

33. Арганізацыя адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі ажыццяўляецца круглагадзічна з 1 верасня па 31 жніўня.

34. Час знаходжання выхаванцаў ва ўстанове пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі вызначаецца Заснавальнікам Установы ў адпаведнасці з запытамі законных прадстаўнікоў выхаванцаў.

Час знаходжання выхаванца ва ўстанове пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі па жаданні яго законнага прадстаўніка можа быць зменшаны.

35. Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі ажыццяўляецца ў групе, індывідуальна.

36. Выхаванцы аб’ядноўваюцца ў рознаўзроставую групу (ад аднаго года да сямі гадоў), групу інтэграванага навучання і выхавання (пры наяўнасці дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця).

37. Напаўняльнасць рознаўзроставай групы, групы інтэграванага навучання і выхавання ажыццяўляецца згодна Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі.

38. Адукацыйны працэс ажыццяўляецца індывідуальна на падставе рашэння кіраўніка Установы ў адпаведнасці з індывідуальным вучэбным планам ці ў выпадках і парадку, вызначаных заканадаўствам.

39. Асноўнымі формамі арганізацыі адукацыйнага працэсу з’яўляюцца гульня, занятак.

40. Ва ўстанове адукацыі пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі ўстанаўліваюцца канікулы, у перыяд якіх заняткі з выхаванцамі не праводзяцца. У перыяд канікул праводзіцца фізкультурна-аздараўленчая і мастацка-эстэтычная работа з выхаванцамі.

Агульная працягласць канікул вызначаецца Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

41. Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі можа быць арганізаваны:

ва ўстанове адукацыі;

дома.

42. Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі арганізуецца па навучальных гадах. Навучальны год дзеліцца на чвэрці.

Працягласць навучальнага года, чвэрцей і канікул устанаўліваецца Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

43. Пры арганізацыі адукацыйнага працэсу навучэнцы I-XI класаў абавязаны прытрымлівацца дзелавога стылю адзення.

44. Адукацыйны працэс пры навучанні і выхаванні на I, II і III ступенях агульнай сярэдняй адукацыі арганізуецца ў рэжыме

шасцідзённага школьнага тыдня, які ўключае пяцідзённы вучэбны тыдзень і адзін дзень тыдня для правядзення з навучэнцамі спартыўна-масавых, фізкультурна-аздараўленчых, іншых выхаваўчых мерапрыемстваў, арганізацыі працоўнага навучання.

45. Вывучэнне вучэбных прадметаў ва Установе ажыццяўляецца на базавым (павышаным) узроўні. Навучэнцы, зыходзячы з пажаданняў і стану здароўя, з улікам заяў іх законных прадстаўнікоў, могуць вывучаць асобныя прадметы на павышаным узроўні на факультатыўных занятках у межах колькасці гадзін, вызначаных вучэбным планам Установы.

46. Ва Установе можа забяспечвацца вывучэнне асобных прадметаў, модуляў на павышаным узроўні пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы базавай адукацыі, вывучэнне асобных прадметаў, модуляў на павышаным узроўні ў рамках арганізацыі профільнага навучання пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі.

На III ступені агульнай сярэдняй адукацыі ў рамках профільнага навучання могуць функцыянаваць класы прафесійнай накіраванасці для арыентацыі на атрыманне педагагічных, ваенных і іншых спецыяльнасцей (педагагічныя класы, ваенна-патрыятычныя класы, прававыя класы і іншыя).

47. Асноўнай формай арганізацыі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі з’яўляецца вучэбны занятак: урок, назіранне, экскурсія і інш. Дадаткова праводзяцца факультатыўныя, стымулюючыя, падтрымліваючыя заняткі, практыка, вучэбна-палявыя зборы, грамадска карысная праца.

48. Факультатыўныя заняткі могуць быць прыродазнаўча-матэматычнай, гуманітарнай, грамадазнаўчай, экалагічнай, ваенна-патрыятычнай, музычнай, харэаграфічнай, мастацкай, тэатральнай, спартыўнай і іншай накіраванасці.

Факультатыўныя заняткі могуць праводзяцца да пачатку або пасля завяршэння ўрокаў. Факультатыўныя заняткі ў V – XI класах могуць праводзіцца ў шосты школьны дзень.

49. Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі ажыццяўляецца ў класах, групах (пры дзяленні класа на групы) або індывідуальна.

50. Рашэнне аб напаўняльнасці класаў, у тым ліку класаў інтэграванага навучання і выхавання, прымаецца заснавальнікам установы пры захаванні санітарна-эпідэміялагічных патрабаванняў у частцы ўмоў размяшчэння і рэжыму адукацыйнага працэсу, у тым ліку нормаў плошчы на аднаго вучня ва ўсіх памяшканнях, у якіх знаходзяцца навучэнцы.

51. Напаўняльнасць класаў інтэграванага навучання і выхавання вызначаецца ў адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі.

52. Адкрыццё класа ва ўстанове можа ажыццяўляцца пры наяўнасці аднаго навучэнца.

53. Класы могуць дзяліцца на групы згодна Палажэння аб установе агульнай сярэдняй адукацыі.

54. Ва Установе для аказання дапамогі сям'і ў навучанні і выхаванні навучэнцаў, стварэння ўмоў для развіцця творчых здольнасцей навучэнцаў могуць адкрывацца групы падоўжанага дня для навучэнцаў I–IX класаў, палажэнне аб якіх зацвярджаецца Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

55. Для навучэнцаў, якія па медыцынскіх паказаннях часова ці пастаянна не могуць наведваць навучальныя заняткі ва Установе, ствараюцца ўмовы для асваення зместу адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі, спецыяльнай адукацыі дома.

Рашэнне аб асваенні адпаведнай адукацыйнай праграмы агульнай сярэдняй адукацыі дома прымаецца Упаўнаважаным органам на падставе заявы навучэнца (законнага прадстаўніка непаўналетняга навучэнца) і заключэння ўрачэбна-кансультацыйнай камісіі, аб атрыманні спецыяльнай адукацыі дома - Упаўнаважаным органам на падставе заявы вучня, заключэння дзяржаўнага цэнтра карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі, а таксама заключэння ўрачэбна-кансультацыйнай камісіі.

Пералік медыцынскіх паказанняў для навучання і выхавання дома вызначаецца Міністэрствам аховы здароўя Рэспублікі Беларусь.

Парадак арганізацыі асваення зместу адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі дома вызначаецца Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь па ўзгадненню з Міністэрствам аховы здароўя.

56. Пры рэалізацыі адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі дапускаецца арганізацыя адукацыйнага працэсу навучэнцаў індывідуальна ў адпаведнасці з індывідуальным вучэбным планам. Індывідуальны вучэбны план устанаўлівае асаблівасці атрымання агульнай сярэдняй адукацыі адоранымі і таленавітымі навучэнцамі, а таксама навучэнцамі, якія па ўважлівых прычынах не могуць пастаянна або часова наведваць вучэбныя заняткі і (або) праходзіць ва ўстаноўленыя тэрміны атэстацыю.

Парадак арганізацыі адукацыйнага працэсу індывідуальна ў адпаведнасці з індывідуальным вучэбным планам вызначаецца Палажэннем аб установе агульнай сярэдняй адукацыі.

57. Забараняецца прыцягненне навучэнцаў да выканання работ (аказання паслуг), не прадугледжаных вучэбна-праграмнай

дакументацыяй, планам выхаваўчай работы ўстановы, праграмамі выхавання.

58. Арганізацыя адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адпаведных адукацыйных праграм ажыццяўляецца ў адпаведнасці з заканадаўствам і ўключае ў сябе тэарэтычнае і практычнае навучанне, выхаваўчую работу, самастойную работу навучэнцаў, атэстацыю навучэнцаў.

59. Працоўная дзейнасць навучэнцаў можа ўключаць грамадска-карысную працу, сферу сацыяльнай дапамогі, часовае працаўладкаванне, працу ў розных формах працоўных аб’яднанняў на працягу навучальнага года і ў канікулярны час. З вучнямі можа праводзіцца работа па самаабслугоўванні і іншых відах грамадска карыснай працы з улікам узросту, нормаў і патрабаванняў гігіены і аховы іх здароўя.

Часовае працаўладкаванне ажыццяўляецца ў адпаведнасці з Працоўным кодэксам Рэспублікі Беларусь.

60. Адукацыйны працэс ва Установе ажыццяўляецца на беларускай мове. Абавязковай для вывучэння з’яўляецца адна з замежных моў: англійская. Пры залічэнні ва Установу вучні V-XI класаў, якія раней вывучалі іншую замежную мову, маюць права на прадаўжэнне яе вывучэння за кошт гадзін, якія фінансуюцца з рэспубліканскага і (або) мясцовага бюджэтаў на правядзенне вучэбных заняткаў.

61. Пры атрыманні агульнай сярэдняй адукацыі вывучэнне беларускай, рускай і адной з замежных моў (англійскай) навучэнцамі, за выключэннем асобных катэгорый асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, з’яўляецца абавязковым. Ад вывучэння беларускай ці рускай мовы могуць быць вызвалены замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства, якія часова знаходзяцца або часова пражываюць у Рэспубліцы Беларусь, у парадку, вызначаным Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

62. Атрыманне адукацыі ва Установе суправаджаецца бягучай, прамежкавай і выніковай атэстацыяй.

Бягучая атэстацыя праводзіцца на вучэбных занятках з выстаўленнем адзнак.

Прамежкавая атэстацыя выражаецца ў выстаўленні адзнак за чвэрць з улікам вынікаў бягучай атэстацыі.

Выніковая атэстацыя праводзіцца па завяршэнні вучэбнага года, навучання і выхавання на II і III ступенях агульнай сярэдняй адукацыі.

Выніковая атэстацыя па завяршэнні навучальнага года выражаецца ў выстаўленні адзнак за год (гадавых адзнак) з улікам вынікаў прамежкавай атэстацыі ў бягучым навучальным годзе.

Выніковая атэстацыя па завяршэнні навучання і выхавання на II і III ступенях агульнай сярэдняй адукацыі выражаецца ў выстаўленні выніковых адзнак па вучэбных прадметах, па якіх праводзяцца выпускныя экзамены, з улікам гадавой і экзаменацыйнай адзнак.

63. Навучэнцам, якія асвоілі змест адукацыйных праграм і паспяхова прайшлі выніковую атэстацыю, выдаецца дакумент аб адукацыі: навучэнцам, якія асвоілі змест адукацыйнай праграмы базавай адукацыі, – пасведчанне аб агульнай базавай адукацыі (пасведчанне аб агульнай базавай адукацыі з адзнакай); навучэнцам, якія асвоілі змест адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі, – атэстат аб агульнай сярэдняй адукацыі (атэстат аб агульнай сярэдняй адукацыі асаблівага ўзору з узнагароджаннем залатым (сярэбраным) медалём).

64. Пасведчанне аб агульнай базавай адукацыі з адзнакай, атэстат аб агульнай сярэдняй адукацыі асаблівага ўзору з узнагароджаннем залатым (сярэбраным) медалём выдаюцца вучням у парадку, які вызначаецца Правіламі правядзення атэстацыі вучняў пры асваенні зместу адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі.

65. Пры выдачы атэстата аб агульнай сярэдняй адукацыі навучэнцы могуць быць узнагароджаны пахвальнымі лістамі ў адпаведнасці з Правіламі правядзення атэстацыі навучэнцаў пры засваенні зместу адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі. Рашэнне аб узнагароджанні навучэнца пахвальным лістом прымаецца дырэктарам Установы.

66. Навучэнцам, якія засвоілі змест адукацыйнай праграмы прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых) у рамках вывучэння вучэбнага прадмета “Працоўнае навучанне” на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі і паспяхова здалі кваліфікацыйны экзамен па адпаведнай прафесіі рабочага (пасады служачага), выдаецца пасведчанне аб прысваенні класіфікацыйнага разраду ( класа, катэгорыі) па прафесіі.

67. Навучэнцам, якія не завяршылі засваенне зместу адукацыйных праграм, пры датэрміновым спыненні адукацыйных адносін (адлічэнні) выдаецца даведка ў парадку, які ўстанаўліваецца Міністэрствам адукацыі.

68. Атэстацыя навучэнцаў пры засваенні зместу адпаведных адукацыйных праграм ажыццяўляецца ў адпаведнасці з правіламі правядзення атэстацыі навучэнцаў пры засваенні зместу адпаведных адукацыйных праграм, якія зацвярджаюцца Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

69. Выхаваўчая работа ва Установе ажыццяўляецца на вучэбных занятках і ў працэсе выхаваўчай работы ў пазаўрочны час. Выхаваўчая

работа з навучэнцамі праводзіцца педагагічнымі работнікамі, класнымі кіраўнікамі.

70. Асноўнымі накірункамі выхаваўчай работы з’яўляюцца: грамадзянскае і патрыятычнае выхаванне, накіраванае на фарміраванне ў навучэнца актыўнай грамадзянскай пазіцыі, патрыятызму, прававой, палітычнай і інфармацыйнай культуры; ідэалагічнае выхаванне, накіраванае на фарміраванне ў навучэнца ведаў асноў дзяржаўнай ідэалогіі, прывіццё падрастаючаму пакаленню агульначалавечых, гуманістычных каштоўнасцей, ідэй, перакананняў, якія адлюстроўваюць сутнасць беларускай дзяржаўнасці; духоўна-маральнае выхаванне, накіраванае на далучэнне навучэнца да агульначалавечых і гуманістычных каштоўнасцей, фарміраванне маральнай культуры; эстэтычнае выхаванне, накіраванае на фарміраванне ў навучэнца эстэтычнага густу, развіццё пачуцця прыгожага; выхаванне псіхалагічнай культуры, накіраванай на развіццё і самаразвіццё асобы навучэнца; выхаванне фізічнай культуры, фізічнае ўдасканаленне; фарміраванне ў навучэнца навыкаў здаровага ладу жыцця, усведамленне значнасці здароўя як каштоўнасці і важнасці яго захавання; сямейнае і гендэрнае выхаванне, накіраванае на фарміраванне ў навучэнца адказнага стаўлення да сям’і, шлюбу, выхавання дзяцей, усвядомленых уяўленняў аб ролі і жыццёвым прызначэнні мужчын і жанчын у сучасным грамадстве; працоўнае і прафесійнае выхаванне, накіраванае на разуменне навучэнцамі працы як асобаснай і сацыяльнай каштоўнасці, гатоўнасці да ўсвядомленага прафесійнага выбару; выхаванне, накіраванае на фарміраванне ў навучэнца беражлівых адносін да навакольнага асяроддзя і прыродакарыстання; выхаванне культуры бяспекі жыццядзейнасці, накіраванае на фарміраванне ў навучэнцаў бяспечных паводзін у сацыяльнай і прафесійнай дзейнасці; выхаванне культуры побыту і вольнага часу, накіраванае на фарміраванне ў навучэнца каштоўнасных адносін да матэрыяльнага асяроддзя, уменні мэтазгодна і эфектыўна выкарыстоўваць вольны час; полікультурнае выхаванне, накіраванае на фарміраванне талерантнага стаўлення да прадстаўнікоў іншых культур, нацыянальнасцей, веравызнанняў; эканамічнае выхаванне, накіраванае на фармаванне эканамічнай культуры асобы.

71. Ва Установе могуць ствараццa дзіцячыя і дарослыя грамадскія арганізацыі і аб’яднанні, пярвічныя арганізацыі грамадскага аб'яднання “Беларуская рэспубліканская піянерская арганізацыя”, грамадскага аб’яднання “Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі”, дзейнасць якіх дазволена ва ўстановах адукацыі Рэспублікі Беларусь, і садзейнічае ўдасканаленню якасці навучання і выхавання. Яны працуюць у адпаведнасці са сваімі Статутамі і палажэннямі, якія не павінны

супярэчыць дзеючаму заканадаўству Рэспублікі Беларусь і Статуту Установы.

72. У мэтах аказання садзеяння ў арганізацыі работы па пытаннях прафілактыкі безнагляднасці і правапарушэнняў непаўналетніх, а таксама ў арганізацыі кантролю за ажыццяўленнем выхаваўчай і прафілактычнай работы ва Установе ствараецца савет па прафілактыцы безнагляднасці і правапарушэнняў непаўналетніх. Парадак стварэння савета па прафілактыцы безнагляднасці і правапарушэнняў непаўналетніх, яго задачы і функцыі, а таксама парадак арганізацыі яго работы вызначаецца Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

73. Харчаванне навучэнцаў ва Установе арганізуецца ў адпаведнасці з санітарнымі правіламі і нормамі харчавання і зацверджанымі грашовымі нормамі харчавання ў залежнасці ад узросту дзяцей па графіку, зацверджанаму дырэктарам.

74. Прапускны рэжым ва Установе ажыццяўляецца ў адпаведнасці з Інструкцыяй аб арганізацыі прапускнога рэжыму, якая зацвярджаецца дырэктарам, і прадугледжвае:

устанаўленне работнікам Установы рэжыму рабочага часу, які вызначаецца правіламі ўнутранага працоўнага распарадку або графікам работ (зменнасці);

прыняцце правіл унутранага распарадку для навучэнцаў;

вызначэнне парадку доступу ў будынак Установы работнікаў, навучэнцаў і іх законных прадстаўнікоў, службовых асоб абслугоўваючых арганізацый, іншых наведвальнікаў;

вызначэнне пераліку прадметаў і рэчываў, забароненых да захоўвання і выкарыстання навучэнцамі ва Установе;

устанаўленне парадку руху транспарту на тэрыторыі Установы;

вызначэнне і абсталяванне спецыяльных месцаў для складзіравання матэрыяльных каштоўнасцей, а таксама захоўвання асабістых рэчаў работнікаў, навучэнцаў;

агароджу, асвятленне і абазначэнне месцаў, небяспечных для здароўя і жыцця людзей.

## ГЛАВА 4
## ПРЫЁМ, ПЕРАВОД І ДЫСЦЫПЛІНАРНАЯ АДКАЗНАСЦЬ НАВУЧЭНЦАЎ УСТАНОВЫ

75. Прыём дзяцей ва Установу ажыццяўляецца ў адпаведнасці з патрабаваннямі, устаноўленымі Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі.

Рашэнне аб залічэнні дзяцей ва Установу афармляецца загадам кіраўніка ўстановы не пазней за 31 жніўня і даводзіцца да ведама іх законных прадстаўнікоў.

76. Прыём у парадку пераводу вучня з адной установы у іншую ажыццяўляецца на падставе заявы яго законнага прадстаўніка.

Рашэнне аб залічэнні навучэнца ва Установу ў парадку пераводу для навучання ў адпаведным класе афармляецца загадам кіраўніка ўстановы не пазней трох дзён з дня падачы заявы і даводзіцца да ведама яго законных прадстаўнікоў.

77. Перавод навучэнцаў у іншыя ўстановы ў выпадку рэарганізацыі, ліквідацыі або адмовы ў дзяржаўнай акрэдытацыі Установы забяспечваецца Заснавальнікам са згоды іх законных прадстаўнікоў.

78. За здзяйсненне дысцыплінарнай правіны да вучня могуць быць прыменены меры дысцыплінарнага спагнання, установленыя Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі

## ГЛАВА 5
## ПРАВЫ І АБАВЯЗКІ ЎДЗЕЛЬНІКАЎ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ

79. Удзельнікамі адукацыйнага працэсу ва Установе з’яўляюцца выхаванцы дашкольнай групы, вучні, педагагічныя работнікі, бацькі і іншыя законныя прадстаўнікі дзяцей.

80. Выхаванцы дзіцячага сада маюць права на:

абарону ад усіх формаў фізічнага і псіхічнага насілля;

ахову жыцця і здароўя падчас знаходжання ва Установе;

абарону яго годнасці і задавальненне патрэб у эмацыянальных зносінах;

развіццё творчых здольнасцей;

кваліфікаваную дапамогу ў карэкцыі фізічных і псіхічных недахопаў развіцця.

81. Навучэнцы маюць права на:

адукацыю ў адпаведнасці з адукацыйнымі праграмамі;

адначасовае асваенне зместу некалькіх адукацыйных праграм асноўнай адукацыі ў выпадках, якія прадугледжаны актамі заканадаўства;

перавод у іншую ўстанову адукацыі у парадку, установленым Урадам Рэспублікі Беларусь;

навучанне і выхаванне ў адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі ў межах зместу адукацыйнай праграмы па індывідуальным плане, індывідуальнай вучэбнай праграме

ў выпадках, якія прадугледжаны Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі;

стварэнне спецыяльных умоў для атрымання адукацыі з улікам асаблівасцяў іх псіхафізічнага развіцця;

павагу чалавечай годнасці, абарону ад усіх форм фізічнага і псіхічнага гвалту, абразу асобы, ахову жыцця і здароўя падчас адукацыйнага працэсу;

бясплатнае псіхолага-медыка-педагагічнае абследаванне ў дзяржаўных цэнтрах карэкцыйна-развіццёвага навучання і рэабілітацыі;

бясплатную карэкцыю парушэнняў фізічнага і псіхічнага развіцця ў дзяржаўных установах адукацыі, якія рэалізуюць праграмы спецыяльнай адукацыі, карэкцыйна-педагагічную дапамогу ў дзяржаўных установах адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы асноўнай, дадатковай і спецыяльнай адукацыі;

бясплатную перавозку навучэнцаў, якія пражываюць у населеных пунктах да Установы адукацыі і назад, у выпадку адсутнасці дзяржаўнай установы адукацыі, якая рэалізуе адпаведныя адукацыйныя праграмы па месцы жыхарства навучэнцаў;

бясплатную перавозку навучэнцаў ад Установы адукацыі да месцаў правядзення экскурсій, наведванне якіх прадугледжана вучэбна-праграмнай дакументацыяй адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі і назад;

карыстанне падручнікамі і вучэбнымі дапаможнікамі ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь;

атрыманне сацыяльна-педагагічнай падтрымкі і псіхалагічнай дапамогі з боку спецыялістаў установы адукацыі;

заахвочванне і ўзнагароджванне за поспехі ў вучэбнай, грамадскай, навуковай дзейнасці, удзел у фізкультурна-аздараўленчых, спартыўна-масавых мерапрыемствах;

удзел у алімпіядах, конкурсах, семінарах, фестывалях, святах і іншых адукацыйных мерапрыемствах;

азнаямленне з пасведчаннем аб дзяржаўнай рэгістрацыі, упаўнаважаным органам, спецыяльным дазволам (ліцэнзіяй) на адукацыйную дзейнасць, сертыфікатамі аб дзяржаўнай акрэдытацыі, правіламі ўнутранага распарадку для навучэнцаў, іншымі лакальнымі прававымі актамі, якія змяшчаюць правы і абавязкі навучэнцаў, а таксама з вучэбна-праграмнай дакументацыяй;

зварот у камісію па вырашэнні канфлікту інтарэсаў педагагічнага работніка ў выпадку ўзнікнення спрэчак паміж удзельнікамі адукацыйных адносін.

Іншыя правы навучэнцаў устанаўліваюцца Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, іншымі актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь, лакальнымі нарматыўнымі прававымі актамі ўстановы.

82. Навучэнцы абавязаны:

добрасумленна і адказна адносіцца да авалодвання зместу адукацыйных праграм, праграм выхаванння;

клапаціцца аб сваім здароўі, імкнуцца да маральнага, духоўнага і фізічнага развіцця і самаўдасканалення;

выконваць правілы ўнутранага распарадку для навучэнцаў;

паважаць чэсць і павагу іншых удзельнікаў адукацыйнага працэсу;

не дапускаць дзеянняў, якія перашкаджаюць іншым удзельнікам адукацыйнага працэсу выконваць іх абавязкі і рэалізоўваць іх правы у сферы адукацыі;

беражліва адносіцца да маёмасці ўстановы;

захоўваць класічны дзелавы стыль ў адзенні.

Іншыя абавязкі навучэнцаў устанаўліваюцца Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, іншымі актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь, лакальнымі нарматыўнымі прававымі актамі ўстановы.

83. Законныя прадстаўнікі непаўналетніх навучэнцаў маюць права на:

азнаямленне з пасведчаннем аб дзяржаўнай рэгістрацыі, упаўнаважаным органам, спецыяльным дазволам (ліцэнзіяй) на адукацыйную дзейнасць, сертыфікатамі аб дзяржаўнай акрэдытацыі, правіламі ўнутранага распарадку для навучэнцаў, іншымі лакальнымі прававымі актамі, якія змяшчаюць правы і абавязкі навучэнцаў, а таксама з вучэбна-праграмнай дакументацыяй;

удзел у кіраванні ўстановай;

абарону правоў і законных інтарэсаў навучэнцаў, уключаючы зварот у камісію па вырашэнні канфлікту інтарэсаў педагагічнага работніка ў выпадку ўзнікнення спрэчак паміж удзельнікамі адукацыйных адносін;

атрыманне інфармацыі аб ходзе і змесце адукацыйнага працэсу, выкарыстоўваемых метадах навучання і выхавання, вынікамі вучэбнай дзейнасці навучэнцаў;

атрыманне інфармацыі аб усіх відах абследаванняў (медыцынскіх, псіхалагічных, педагагічных) навучэнцаў.

Іншыя правы законных прадстаўнікоў навучэнцаў устанаўліваюцца Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, іншымі актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь, лакальнымі нарматыўнымі прававымі актамі ўстановы.

84. Законныя прадстаўнікі непаўналетніх навучэнцаў абавязаны:

забяспечваць умовы для атрымання адукацыі і развіцця навучэнцаў;

паважаць гонар і годнасць усіх удзельнікаў адукацыйнага працэсу;

забяспечыць выкананне навучэнцамі, законнымі прадстаўнікамі якіх яны з’яўляюцца, патрабаванняў ўстаноўчых дакументаў, правілаў унутранага распарадку для навучэнцаў.

Іншыя абавязкі законных прадстаўнікоў навучэнцаў устанаўліваюцца Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, іншымі актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь, лакальнымі нарматыўнымі прававымі актамі ўстановы.

У адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь бацькі і іншыя законныя прадстаўнікі непаўналетніх навучэнцаў нясуць адказнасць за неналежнае выхаванне дзіцяці.

85. Выхаванне навучэнцаў установы забяспечваецца ва ўзаемадзеянні іх законных прадстаўнікоў з педагагічнымі работнікамі.

86. Матэрыяльнае забеспячэнне, меры сацыяльнай абароны навучэнцаў ажыццяўляюцца ў парадку, устаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

87. Дысцыплінарнае спагнанне да навучэнцаў прымяняецца ў парадку, устаноўленым правіламі ўнутранага распарадку ўстановы для навучэнцаў, Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, а таксама ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

88. Педагагічнымі работнікамі прызнаюцца асобы, якія ажыццяўляюць педагагічную дзейнасць (рэалізуюць змест адукацыйных праграм, праграм выхавання, ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне адукацыі і (або) ажыццяўляюць кіраўніцтва адукацыйнай дзейнасцю ўстановы).

89. Парадак прызначэння (вызвалення) на пасады педагагічных работнікаў вызначаецца Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі і іншымі актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

90. Педагагічныя работнікі ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь маюць права на:

абарону прафесійнага гонару і годнасці;

забеспячэнне ўмоў для ажыццяўлення прафесійнай дзейнасці;

творчую ініцыятыву, свабоду выбару педагагічна абгрунтаваных форм і метадаў навучання і выхавання, вучэбных выданняў і сродкаў навучання;

доступ да вучэбна-праграмнай, вучэбна-метадычнай дакументацыі, інфармацыйна-аналітычных матэрыялаў;

удзел у абнаўленні, распрацоўцы і вызначэнні структуры і зместу структурных элементаў навукова-метадычнага забеспячэння адукацыі;

удзел у навуковай, навукова-практычнай, эксперыментальнай, інавацыйнай, міжнароднай дзейнасці ўстановы;

удзел у кіраванні ўстановай;

павышэнне кваліфікацыі;

маральнае і матэрыяльнае заахвочванне за поспехі ў педагагічнай дзейнасці;

аб’яднанне ў прафесійныя саюзы, іншыя грамадскія аб’яднанні, дзейнасць якіх не супярэчыць заканадаўству Рэспублікі Беларусь;

бясплатны праезд у аўтобусе да месца працы і назад школьнымі аўтобусамі па маршруце іх руху, пры наяўнасці свабодных пасадачных месцаў у школьным аўтобусе.

91. У мэтах урэгулявання рознагалоссяў паміж удзельнікамі адукацыйных адносін у выпадку ўзнікнення канфлікту інтарэсаў педагагічнага работніка ва Установе ствараецца камісія па вырашэнні канфлікту інтарэсаў педагагічнага работніка.

Парадак стварэння, арганізацыі работы, прыняцця рашэнняў камісіяй па вырашэнні канфлікту інтарэсаў педагагічнага работніка і іх выкананне ўстанаўліваецца Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Іншыя правы педагагічных работнікаў устанаўліваюцца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, устаноўчымі дакументамі і іншымі лакальнымі нарматыўнымі прававымі актамі ўстановы, іх працоўнымі дагаворамі.

92. Педагагічныя работнікі абавязаны:

ажыццяўляць сваю дзейнасць на прафесійным узроўні, які забяспечвае рэалізацыю адукацыйных праграм, праграм выхавання;

захоўваць прававыя, маральныя і этычныя нормы;

паважаць гонар і годнасць навучэнцаў, выхаванцаў і іншых удзельнікаў адукацыйнага працэсу;

павышаць свой прафесійны ўзровень, праходзіць атэстацыю;

прапагандаваць здаровы лад жыцця сярод навучэнцаў;

забяспечваць захаванне спецыяльных умоў, неабходных для атрымання адукацыі асобам з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця;

забяспечваць бяспечныя ўмовы для навучэнцаў і выхаванцаў у перыяд адукацыйнага і выхаваўчага працэсу, несці за гэта адказнасць;

працоўную дысцыпліну, выконваць правілы ўнутранага працоўнага распарадку для работнікаў установы;

выконваць правілы і нормы аховы працы;

выконваць устаноўлены парадак афармлення і захоўвання дакументаў, захоўвання вучэбных дапаможнікаў і матэрыяльных каштоўнасцей, беражліва адносіцца да маёмасці ўстановы;

падтрымліваць сваё працоўнае месца, абсталяванне, інструментарый ў спраўным стане, парадку і чысціні;

выконваць загады і распараджэнні дырэктара і яго намесніка, рашэнні, прынятыя педагагічным саветам;

праходзіць папярэдні медыцынскі агляд пры паступленні на працу і перыядычныя медыцынскія агляды ў парадку, які ўстанаўліваецца Міністэрствам аховы здароўя Рэспублікі Беларусь;

прытрымлівацца дзелавога стылю адзення і выконваць правілы этыкету.

93. Да іншых работнікаў Установы адносяцца асобы, якія ажыццяўляюць адміністрацыйна-гаспадарчыя, вытворчыя і іншыя дапаможныя функцыі.

94. Правы і абавязкі іншых работнікаў Установы ўстанаўліваюцца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, сапраўдным Статутам і іншымі лакальнымі нарматыўнымі прававымі актамі Установы, іх працоўнымі дагаворамі.

95. Педагагічным работнікам забараняецца выкарыстоўваць адукацыйны і выхаваўчы працэсы ў палітычных мэтах або для прымушэння навучэнцаў да дзеянняў, якія супярэчаць Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і заканадаўству.

96. Педагагічныя работнікі, вучні, бацькі і іншыя законныя прадстаўнікі непаўналетніх навучэнцаў ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь нясуць адказнасць за пашкоджанне памяшканняў і пабудоў Установы, вучэбнага абсталявання, інвентару і іншай маёмасці.

## ГЛАВА 6
## КІРАВАННЕ ЎСТАНОВАЙ

97. Непасрэднае кіраўніцтва Установай ажыццяўляе яе дырэктар, які прызначаецца на пасаду і вызваляецца ад пасады Упаўнаважаным органам па ўзгадненню з Заснавальнікам.

98. Дырэктар Установы ў дзейнасці па кіраванні гэтай установай узаемадзейнічае з органамі самакіравання Установы.

99. Органы самакіравання Установы ствараюцца і ажыццяўляюць сваю дзейнасць у адпаведнасці з заканадаўствам, Статутам установы.

100. Асноўным органам самакіравання Установы з’яўляецца педагагічны савет установы, які ўзначальвае дырэктар.

101. На пасяджэннях педагагічнага савета могуць заслухоўвацца пытанні:

выкананне рашэнняў папярэдніх пасяджэнняў педагагічнага савета;

стварэнне бяспечных умоў навучання і выхавання;

арганізацыя развіваючага і здароўезберагальнага адукацыйнага асяроддзя;

варыятыўнасці атрымання агульнай сярэдняй адукацыі навучэнцамі з асаблівымі індывідуальнымі адукацыйнымі патрэбнасцямі і індывідуальнымі магчымасцямі;

удасканаленне зместу і выбару педагагічна абгрунтаваных форм, метадаў і сродкаў навучання і выхавання;

укараненне эфектыўных адукацыйных тэхналогій, сучасных інфармацыйных камунікацыйных тэхналогій у адукацыйны працэс;

стварэнне ўмоў для ўдасканалення прафесійных кампетэнцый педагагічных работнікаў Установы;

вызначэнне шляхоў супрацоўніцтва Установы з сям'ёй, установамі адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы прафесійна-тэхнічнай сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі, установамі аховы здароўя, іншымі арганізацыямі;

аб тэматыцы і выніках эксперыментальнай і інавацыйнай дзейнасці ў сферы адукацыі;

іншыя пытанні дзейнасці Установы.

102. Дзейнасць педагагічнага савета ажыццяўляецца ў адпаведнасці з планам работы, які складаецца на навучальны год і зацвярджаецца дырэктарам пасля разгляду на пасяджэнні педагагічнага савета. Змест плана работы вызначаецца актуальнымі задачамі, якія стаяць перад установай.

Педагагічны савет ажыццяўляе сваю работу ў форме пасяджэнняў, якія склікаюцца не радзей аднаго разу ў чвэрць у адпаведнасці з планам работы ці па меры неабходнасці для вырашэння пытанняў, якія адносяцца да кампетэнцыі педагагічнага савета.

Пасяджэнні педагагічнага савета лічацца паўнамоцнымі, калі на іх прысутнічае не менш двух трэціх членаў педагагічнага савета.

Рашэнні педагагічнага савета прымаюцца адкрытым галасаваннем большасцю галасоў.

Рашэнні педагагічнага савета пасля зацвярджэння іх загадам дырэктара з'яўляюцца абавязковымі для выканання ўсімі педагагічнымі работнікамі і навучэнцамі ўстановы (іх законнымі прадстаўнікамі).

103. Ва Установе могуць стварацца іншыя органы самакіравання: савет установы, папячыцельскі савет, бацькоўскі камітэт, вучнёўскі савет, дзейнассць якіх ажыццяўляецца ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам.

104. Рашэнне аб стварэнні папячыцельскага савета прымаецца ініцыятыўнай групай, у склад якой могуць уваходзіць законныя

прадстаўнікі навучэнцаў, педагагічныя работнікі, прадстаўнікі грамадскіх аб’яднанняў і іншых арганізацый, іншыя асобы.

У склад папячыцельскага савета ўваходзяць законныя прадстаўнікі навучэнцаў, педагагічныя работнікі, прадстаўнікі грамадскіх аб’яднанняў і іншых арганізацый.

Рашэнне аб уключэнні ў склад папячыцельскага савета прымаецца агульным сходам папячыцельскага савета.

Вышэйшым органам кіравання саветам з’яўляецца агульны сход. Узначальвае агульны сход папячыцельскага савета старшыня савета, які выбіраецца на 3 гады.

Агульныя сходы праводзяцца па меры неабходнасці, але не радзей аднаго разу ў паўгоддзе.

Рашэнні прымаюцца простай большасцю прысутных членаў папячыцельскага савета.

Рашэнні папячыцельскага савета носяць кансультатыўны і рэкамендацыйны характар.

105. Дырэктар Установы:

арганізуе работу Установы;

дзейнічае ад імя Установы без даверанасці і нясе адказнасць за вынікі яго дзейнасці;

у межах сваёй кампетэнцыі выдае загады і дае ўказанні, абавязковыя для работнікаў і непаўналетніх ва Установе;

па ўзгадненні з заснавальнікам зацвярджае структуру і штатны расклад Установы;

ажыццяўляе прыём і звальненне работнікаў, зацвярджае іх службовыя інструкцыі;

заключае дагаворы ад імя Установы;

у межах, устаноўленых заканадаўствам, вызначае формы, сістэмы і памеры аплаты працы работнікаў Установы, кіраўнікоў яе філіялаў, прадстаўніцтваў;

у адпаведнасці з заканадаўствам ужывае меры заахвочвання і дысцыплінарнага ўздзеяння да работнікаў і навучэнцаў Установы;

у межах, устаноўленых заканадаўствам і сапраўдным Статутам, распараджаецца маёмасцю, у тым ліку сродкамі Установы, і нясе персанальную адказнасць за захаванасць маёмасці і яе эфектыўнае выкарыстанне;

выступае прадстаўніком наймальніка ў калектыўных дагаворах з работнікамі Установы;

ажыццяўляе іншыя паўнамоцтвы і функцыі, прадугледжаныя заканадаўствам.

# ГЛАВА 7
# ПАРАДАК ФАРМІРАВАННЯ СТРУКТУРЫ І ШТАТНАГА РАСКЛАДУ ЎСТАНОВЫ

106. Структура Установы зацвярджаецца дырэктарам і фарміруецца з улікам неабходнасці вырашэння стратэгічных і аператыўных задач у мэтах развіцця сістэмы адукацыі, прафесійнага развіцця кадраў у адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

107. У выпадку неабходнасці па ўзгадненню з Заснавальнікам і Упаўнаважаным органам ва Установе могуць быць створаны структурныя падраздзяленні, фарміраванне якіх ажыццяўляецца ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь і сапраўдным Статутам.

108. Працоўныя адносіны работнікаў ва Установе рэгулююцца працоўнымі дагаворамі (кантрактамі), якія заключаюцца ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам, калектыўным дагаворам, правіламі ўнутранага працоўнага распарадку Установы.

109. Дырэктар ажыццяўляе прыём, звальненне педагагічных і іншых работнікаў Установы ў адпаведнасці з заканадаўствам.

110. На педагагічную працу прымаюцца асобы, якія маюць неабходную прафесійную адукацыю або спецыяльную адукацыю пры ўмове праходжання імі інтэграваных курсаў псіхолага-педагагічнай падрыхтоўкі, з прадстаўленнем адпаведных пацвярджаючых дакументаў.

Асноўныя патрабаванні, што прад’яўляюцца да педагагічных работнікаў, вызначаюцца кваліфікацыйнымі характарыстыкамі, якія зацвярджаюцца ў парадку, устаноўленым заканадаўствам.

111. Да педагагічнай дзейнасці не дапускаюцца асобы, якім занятак дадзенай дзейнасцю забаронены рашэннем суда або па медыцынскіх паказчыках, асобы, прызнаныя недзеяздольнымі або абмежавана-дзеяздольнымі, таксама асобы, якія былі асуджаны за пэўныя злачынствы. Пералік адпаведных медыцынскіх супрацьпаказанняў і саставаў злачынстваў вызначаецца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

112. Аплата працы работнікаў Установы ажыццяўляецца ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам, дзеючымі ва ўстанове палажэннямі аб прэміраванні, аб надбаўках і даплатах (матэрыяльным стымуляванні).

113. Атэстацыя педагагічных работнікаў і спецыялістаў Установы і прысваенне разрадаў іншым работнікам ажыццяўляецца ў парадку, які вызначаецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь, Міністэрствам

адукацыі Рэспублікі Беларусь, Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 8
## МАЁМАСЦЬ І СРОДКІ ЎСТАНОВЫ

114. Матэрыяльна-тэхнічная база Установы фарміруецца Заснавальнікам у адпаведнасці з патрабаваннямі, якія ўстаноўлены актамі заканадаўства.

115. Матэрыяльна-тэхнічную базу Установы складаюць зямельны ўчастак, будынак і памяшканні, інжынерныя камунікацыі, абсталяванне і іншая маёмасць, якая выкарыстоўваецца для навучання, выхавання, аздараўлення навучэнцаў і для рашэння іншых задач у сферы адукацыі.

116. Установа валодае і карыстаецца маёмасцю ў адпаведнасці з яе прызначэннем, сваімі статутнымі мэтамі, заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

117. Установа не мае права без згоды Заснавальніка адчужаць ці іншым спосабам распараджацца замацаванай за ёй маёмасцю і маёмасцю, набытай за кошт сродкаў, вылучаных ёй па смеце.

118. Установа нясе адказнасць за захаванасць і эфектыўнае выкарыстанне маёмасці.

119. Установа для арганізацыі адукацыйнага працэсу можа выкарыстоўваць матэрыяльна-тэхнічную базу іншых арганізацый у парадку, прадугледжаным дзеючым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

120. Маёмасць Установы складаюць асноўныя фонды і абаротныя сродкі, а таксама іншыя каштоўнасці, якія ўлічваюцца ва ўстаноўленым парадку на балансе ўстановы адукацыі Упаўнаважанага органа.

121. Крыніцамі фінансавання ўстановы з’яўляюцца:

бюджэтныя сродкі;

бязвыплатная (спонсарская) дапамога;

дабрачынныя ўзносы, ахвяраванні юрыдычных і фізічных асоб;

іншыя крыніцы, не забароненыя дзеючым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

122. Установа можа ажыццяўляць дзейнасць, якая прыносіць даходы ў адпаведнасці з актамі заканадаўства.

123. Сродкі, атрыманыя Установай ад дзейнасці, якая прыносіць даходы, паступаюць у яе самастойнае распараджэнне і расходуюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам і сапраўдным Статутам.

124. Установа можа ажыццяўляць платную адукацыйную дзейнасць па аказанні дадатковых адукацыйных паслуг, якія не фінансуюцца з бюджэту. Кошт дадатковых адукацыйных паслуг

вызначаецца ў адпаведнасці з заканадаўствам, з улікам эканамічна абгрунтаваных затрат і зацвярджаецца ўпаўнаважаным уласнікам.

125. Установа самастойна вызначае магчымасці і аб'ём аказання паслуг пры рэалізацыі адукацыйных праграм на платнай аснове, зыходзячы з наяўнасці матэрыяльных і кадравых рэсурсаў, попыту на адпаведныя паслугі.

126. Платныя паслугі могуць аказвацца толькі са згоды законных прадстаўнікоў навучэнцаў.

127. Пры аказанні платных адукацыйных паслуг Установа афармляе дагавор з заказчыкам на аказанне паслуг.

128. Разлік цэн на платныя адукацыйныя паслугі ажыццяўляе дзяржаўная ўстанова "Валожынскі раённы цэнтр па забеспячэнні дзейнасці бюджэтных арганізацый" у адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам.

129. Умацаванне, абнаўленне і развіццё матэрыяльна-тэхнічнай базы Установы ажыццяўляецца за кошт бюджэтных сродкаў, а таксама сродкаў, атрыманых у выніку аказання платных адукацыйных і іншых паслуг, добраахвотных ахвяраванняў фізічных асоб, аказання спонсарскай дапамогі арганізацый і юрыдычных асоб, іншых відаў дзейнасці, якія не супярэчаць заканадаўству Рэспублікі Беларусь.

130. Спонсарамі Установы могуць быць індывідуальныя прадпрымальнікі, юрыдычныя асобы, а таксама іншыя асобы ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, зацікаўленыя ў станаўленні і развіцці Установы.

131. Справаводства і архіўная справа ва Установе вядзецца ў парадку, устаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь. Наменклатура спраў Установы зацвярджаецца дырэктарам Установы на каляндарны год.

132. Мовамі справаводства з'яўляюцца беларуская і руская мовы ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь. Дапускаецца выкарыстанне рускай мовы пры арганізацыі і правядзенні пазакласнай работы, культурна-масавых і спартыўных мерапрыемстваў, афармлення інфармацыйнай прасторы Установы.

133. Кантроль за фінансава-гаспадарчай дзейнасцю Установы ажыццяўляецца ў парадку, устаноўленым актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

134. За непрадстаўленне і скажэнне дзяржаўнай справаздачы, парушэнне тэрмінаў яе прадстаўлення, службовыя асобы Установы нясуць устаноўленую заканадаўствам Рэспублікі Беларусь адказнасць.

135. Рэвізія дзейнасці Установы праводзіцца ў парадку, устаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

136. Установа не мае права без згоды Заснавальніка (упаўнаважанага ім органа) адчужаць ці іншым спосабам распараджацца замацаванай за ім маёмасцю, набытай за кошт сродкаў, выдзеленых яму па каштарысе.

## ГЛАВА 9
## УЛІК, СПРАВАЗДАЧНАСЦЬ І КАНТРОЛЬ ЗА ДЗЕЙНАСЦЮ ЎСТАНОВЫ

137. Бухгалтарскі ўлік ажыццяўляецца дзяржаўнай установай “Валожынскі раённы цэнтр па забеспячэнні дзейнасці бюджэтных арганізацый”. Формы і парадак вядзення бухгалтарскага ўліку устанаўліваюцца Міністэрствам фінансаў Рэспублікі Беларусь.

138. За непрадстаўленне і (або) скажэнне дзяржаўнай справаздачнасці, парушэнне тэрмінаў яе прадстаўлення службовыя асобы Установы нясуць устаноўленую заканадаўствам адказнасць.

139. Кантроль за фінансава-гаспадарчай дзейнасцю Установы ажыццяўляецца ў парадку, устаноўленым актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 10
## МІЖНАРОДНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

140. Міжнароднае супрацоўніцтва у сферы адукацыі накіравана на атрыманне адукацыі грамадзянамі Рэспублікі Беларусь у замежных арганізацыях, замежнымі грамадзянамі і асобамі без грамадзянства, часова знаходзячыміся ў Рэспубліцы Беларусь, ва ўстановах адукацыі Рэспублікі Беларусь, іншых арганізацыях сістэмы адукацыі Рэспублікі Беларусь, на абмен навучэнцамі, педагагічнымі работнікамі, а таксама на ўдзел у міжнародных адукацыйных мерапрыемствах.

141. Міжнароднае супрацоўніцтва ў сферы адукацыі ажыццяўляецца на падставе міжнародных дамоў Рэспублікі Беларусь, дамоў, якія заключаюцца паміж установай  адукацыі Рэспублікі Беларусь, іншай арганізацыяй сістэмы адукацыі Рэспублікі Беларусь і замежнай арганізацыяй, міжнароднай аргінізацыяй, замежным грамадзянінам, асобай без грамадзянства, часова пражываючым у Рэспубліцы Беларусь, міжнародных і нацыянальных праектаў і праграм у сферы адукацыі.

142. Міжнароднае супрацоўніцтва Установы ажыццяўляецца ў адпаведнасці з актамі заканадаўства на прынцыпах незалежнасці, роўнасці, узаемнай выгады, узаемнай павагі і не павінна наносіць урон

суверэнітэту Рэспублікі Беларусь, нацыянальнай бяспецы і інтарэсам асобы, грамадства і дзяржавы.

## ГЛАВА 11
## ПАРАДАК УНЯСЕННЯ ЗМЯНЕННЯЎ І/АБО ДАПАЎНЕННЯЎ У СТАТУТ

143. Гэты Статут уступае ў сілу з моманту яго дзяржаўнай рэгістрацыі ў парадку, устаноўленым дзеючым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

144. Змяненні і дапаўненні ў Статут ўносяцца пасля іх зацвярджэння ў парадку, устаноўленым дзеючым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 12
## ПАРАДАК РЭАРГАНІЗАЦЫІ І ЛІКВІДАЦЫІ ЎСТАНОВЫ

145. Рэарганізацыя і ліквідацыя Установы ажыццяўляецца ў парадку, устаноўленым дзеючым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

146. Рашэнне аб рэарганізацыі ці ліквідацыі Установы прымаецца Заснавальнікам на падставе ацэнкі наступстваў такой рэарганізацыі/ліквідацыі з улікам колькасці асоб, якія належаць да навучання на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі на тэрыторыі адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі, і колькасці дзяржаўных устаноў, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі на гэтай тэрыторыі.

147. У выпадку спынення дзейнасці Установы, анулявання, спынення дзеяння спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі) на адукацыйную дзейнасць, Заснавальнік прымае меры па пераводу навучэнцаў з іх згоды або згоды законных прадстаўнікоў непаўналетніх навучэнцаў у іншыя ўстановы адукацыі, якія рэалізуюць адпаведныя адукацыйныя праграмы, у парадку, які ўстанаўліваецца Урадам Рэспублікі Беларусь.

148. У выпадку ліквідацыі Установы органам, які прыняў рашэнне аб ліквідацыі, ствараецца камісія, якая здзяйсняе свае паўнамоцтвы ў рамках з дзеючым заканадаўствам.

149. Грашовыя сродкі і маёмасць Установы, якія засталіся пасля ліквідацыі, у абавязковым парадку перадаюцца Упаўнаважанаму органу.

150. Установа лічыцца ліквідаванай або рэарганізаванай з моманту ўнясення запісу ў Адзіны дзяржаўны рэгістр юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў.